каванымі маёмасцямі, разглядала службовыя злачынствы. Штат мясцовых упраўленняў складаўся з начальнікаў, іх памочнікаў, чыноў асобых даручэнняў, справаводаў і інш. У сувязі з пашырэннем функцый упраўленняў земляробства і дзяржаўных маёмасцей у іх штат уводзіліся спецыялісты па малочнай гаспадарцы[1]. Згодна з пастановай Дзяржаўнага савета ад 3 чэрвеня 1902 г. аб правядзенні гідратэхнічных мерапрыемстваў, з 1 студзеня 1903 г. у структуры ўпраўлення ствараўся гідратэхнічны аддзел, у які ўваходзілі інжынеры-гідратэхнікі і тэхнікі.

## 6.2. Дзейнасць землеўпарадкавальных камісій па рэалізацыі сталыпінскай аграрнай рэформы

*(А. П. Жытко, С. А. Талмачова, К. Ю. Тарановіч)*

Падрыхтоўка аграрнай рэформы ў пачатку XX ст. прывяла да рэарганізацыі Міністэрства земляробства і дзяржаўных маёмасцей. Указам ад 6 мая 1905 г. яно было пераўтворана ў **Галоўнае ўпраўленне землеўпарадкавання і земляробства**. Рэфармаванаму ведамству перадаваліся справы па пытаннях землеўладкавання і землекарыстання сельскіх абывацелей, адмежавання сялянскіх надзельных земляў, перасялення сялян, арганізацыі зямельнага крэдыту, а таксама разгляд справаздач Дваранскага і Сялянскага пазямельных банкаў. Згодна з Маніфестам ад 3 лістапада 1905 г. на 50 % скарачаліся выкупныя плацяжы, у сувязі з чым Сялянскі пазямельны банк арганізоўваў куплю зямлі сялянамі на льготных умовах. Функцыі новага органа значна пашырыліся пасля выдання ўказа ад 4 сакавіка 1906 г. аб стварэнні **губернскіх і паветовых землеўпарадкавальных камісій**[2] з мэтай практычнай рэалізацыі сталыпінскай аграрнай рэформы.

Першапачаткова меркавалася адкрыць землеўпарадкавальныя камісіі двух тыпаў: 1) з поўнымі землеўпарадкавальнымі функцыямі і 2) абмежаваныя толькі функцыяй садзейнічання Сялянскаму пазямельнаму банку. Аднак у першым наказе камі-

[1] Подорожняя, Е. А. Эволюция органов управления государственными имуществами в Беларуси (конец XVIII –начало XX в.) // Весці БДПУ. – Сер. 2. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2014. – № 2. – С. 33–37.

[2] ПСЗРИ. Собр. 3-е. – Т. 26 (1906). – Отд. 1.– № 27478. – С. 199–201.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ